5. Арбатова Н. Независимость Косово и взаимозависимый мир // Год планеты: ежегодник / Ин-т мировой экономики и международ. отношений РАН. Вып. 2008 г.: экономика, политика, безопасность [гл. ред. В.Г.Барановский]. М.: Наука, 2008. С.101-114.
6. Шустов В. Эволюция миротворчества ООН //Международная жизнь. 2008, №10 С.61–73.
7. Адоньев В., Сучков Е. Косовский эксперимент открыл “ящик Пандоры” мирового сепаратизма //ИТАР-ТАСС. М., ДИПКУРЬЕР. 2012, № 7. С.30-35.
8. Николич Т. Боль сербского сердца. Проблемы сохранения исторического наследия в Косово //Беларуская думка. 2015, №11. С.14-23.
9. Варивода С. Уроки референдума в Косово //ИТАР-ТАСС. М., КОМПАС. 2012. №10. С.45-51.
10. Соколова П.С. Евро-атлантическая ориентация Западных славян //Мировая экономика и международные отношения. 2016, №7. с. 37-47.
11. Федорова М. Белград - Приштина: сближение взглядов? //Компас. Вестник международной аналитической информации /Информационное телеграфное агентство России. 2014, №10. С. 13.
12. Михайлович Д. Геополитика будущего: войны за ресурсы и новый империализм //Свободная Мысль. 2016, №2. С. 59-80.
13. Пономарева Е.Г. Проект «Косово»: мафия, НАТО и большая политика /De Conspiratione. Сб. М.: Товарищество научных изданий КМК, 2013. 522 с.
14. Цит. по: Нарочницкая Н. Предисловие к русскому изданию //Терзич С. Старая Сербия (XIX – XX вв.). Драма одной европейской цивилизации. М.: Вече, 2015. 480 с.
15. Пономарева Е.Г., Рудов Г.А. «Государство-бандит»: Косово в мировой системе //Обозреватель – Observer. 2013, №5. С. 73-85.
16. Романова Н. Историю делают личности, которых поддерживает народ // Советская Белоруссия. 2013. 14 марта.
17. Горбатюк Н. Wikileaks: Разоблачения, изменившие мир /Надежда Горбатюк. М.: Эксмо, 2011. 208 с.
18. Лару Д., Забродин А. Евросоюз не видит сербов в Косово // Известия. 2018. 20 апреля. С. 3.
19. Мир в XXI веке: прогноз развития международной обстановки по странам и регионам /под ред. М.В. Александрова, О.Е. Родионова. М.: МГИМО-Университет, 2018. 756 с.

УДК 94(437.3+439) “1939/1941”

## СЛАВАЦКА-ВЕНГЕРСКІЯ МІЖДЗЯРЖАЎНЫЯ АДНОСІНЫ ЯК ФАКТАР НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ СЛАВАЦКАГА ЎРАДА 1939-1941 ГГ.

**А.С. Кандраценка**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь; kandratikas@gmail.com*

Разглядаецца ўплыў міждзяржаўных славацка-венгерскіх адносін на нацыянальную палітыку славацкага ўрада ў дачыненні да мясцовых венграў. Асобая ўвага надаецца перыяду 1939-1941 гг., як асноўнаму этапу ў станаўленні пазіцыі славацкага кіраўніцтва ў венгерскім пытанні. Прааналізавана становішча славацкіх зямель напярэдадні яе ўзнікнення 14 сакавіка 1939 г. Вызначаны прававы статус, роля і месца венгерскага насельніцтва Славакіі. Адзначаецца існаванне прынцыпу ўзаемнасці на дзяржаўным узроўні, які заключыў у сабе вырашэнне шэрагу прававых пытанняў у розных сферах дзейнасці. Выяўлены нямецкі ўплыў на дадзены рэгіён і на вырашэнне славацка-венгерскіх памежных канфліктаў. Выкарыстанне гісторыка-генетычнага метаду дазволіла раскрыць заканамернасці ў фарміраванні адметных рысаў нацыянальнай палітыкі Славацкай Рэспублікі і прававога статусу славацкіх венграў.

***Ключавыя словы:*** Славацкая Рэспубліка; славацка-венгерскія адносіны; нацыянальная палітыка; венгерскае насельніцтва; Венскі арбітраж; нацыянальныя меншасці.

# СЛОВАЦКО-ВЕНГЕРСКИЕ МЕЖГОСУДАРСТВЕННЫЕ ОТНОШЕНИЯ КАК ФАКТОР НАЦИОНАЛЬНОЙ ПОЛИТИКИ СЛОВАЦКОГО ПРАВИТЕЛЬСТВА 1939-1941 ГГ.

**А.С. Кондратенко**

*Белорусский государственный университет,*
*пр. Независимости, 4 220030, г. Мінск, Беларусь; kandratikas@gmail.com*

Рассматривается влияние межгосударственных словацко-венгерских отношений на национальную политику словацкого правительства в отношении местных венгров. Особое внимание уделяется периоду 1939-1941 гг., как основному этапу в становлении позиции словацкого руководства в венгерском вопросе. Проанализировано положение словацких земель накануне ее возникновения 14 марта 1939 г. Определен правовой статус, роль и место венгерского населения Словакии. Отмечается существование принципа взаимности на государственном уровне, который заключил в себе решение ряда правовых вопросов в различных сферах деятельности. Выявлены немецкое влияние на данный регион и на решение словацко-венгерских пограничных конфликтов. Использование историко-генетического метода позволило раскрыть закономерности в формировании отличительных черт национальной политики Словацкой Республики и правового статуса словацких венгров.

***Ключевые слова:*** Словацкая Республика; словацко-венгерские отношения; национальная политика; венгерское население; Венский арбитраж; национальные меньшинства.

# SLOVAK-HUNGARIAN INTER-STATE RELATIONS AS A FACTOR OF THE NATIONAL POLICY OF SLOVAK GOVERNMENT 1939-1941

**A. Kandratsenka**

*Belarusian State University, Niezavisimosti Ave., 4, 220030, Minsk, Belarus, kandratikas@gmail.com*

The article addresses the impact of inter-State Slovak-Hungarian relations on national policy of the Government of Slovakia for the local Hungarian. Special emphasis is placed on the period 1939-1940 as the main phase of the establishment of the Slovak leadership’s stance on the Hungarian question. The position of the Slovak lands on the eve of its emergence on 14 March 1939 was reviewed. The legal status, role and place of the Hungarian population of Slovakia were defined. The article notes the existence of the principle of reciprocity at the State level which consisted in the solution of several legal issues in various fields of activity. The German influence on this region and resolution of Slovak-Hungarian border conflicts was determined. The application of the historical-genetic method has enabled revealing of the patterns in the formation of the characteristics of the national policy of the Slovak Republic and the legal status of the Slovak Hungarian.

***Key words:*** Slovak Republic; Slovak-Hungarian relations; national policy; Hungarian population; Vienna Award; national minorities.

Мюнхенская змова, а потым Венскі арбітраж 1938 года стварылі перадумовы для ліквідацыі Чэхаславакіі, што з‘яўлялася мэтай урада нацысцкай Германіі. У якасці стратэгічна-тактычнага варыянта нямецкімі лідарамі быў абраны дыферынцаваны падыход да чэхаў і славакаў з мэтай дасягнення стану, пры якім ліквідацыя чэхаславацкай дзяржавы выглядала б як унутраны распад. Існуе меркаванне, што аўтаномія Славакіі была сродкам адрыву славацкай тэрыторыі ад Чэхаславакіі. Так, 6 кастрычніка 1938 г. выканаўчы камітэт партыі абвясціў у Жыліне аўтаномію Славакіі. Аўтаномны ўрад з самага пачатку сутыкнуўся з цяжкай задачай. Неабходна было абараніць славацкую граніцу ад тэрытарыяльных памкненняў Венгрыі і Польшчы, якія прад’явілі свае прэтэнзіі на тэрыторыі, дзе кампактна пражывалі венгерская і польская этнічныя меншасці. У паветры вітала ідэя раздзела Славакіі.

Чэхаславацкі ўрад, жадаючы пазбегнуць сур’ёзнага канфлікту з Польшчай, перадаў ёй частку Сілезіі і паўночнай Славакіі. Перамовы з Венгрыяй, якая патрабавала ўсе славацкія землі, вынікаў не далі. Так, 2 лістапада 1938 г. міністры замежных спраў Германіі і Італіі падпісалі ў Вене пагадненне аб новай мяжы паміж Славакіяй, Падкарпацкай Руссю і Венгрыяй. Венгрыі была перададзена тэрыторыя ў 10 309 кв. км. з насельніцтвам у 853 670 чалавек, з каторых 272 145 былі славакамі па

нацыянальнасці [1, с. 210]. 19 лістапада 1938 г. чэхаславацкі ўрад прыняў закон аб аўтаноміі Славакіі, які прадугледжваў перадачу часткі заканадаўчай і выканаўчай улады аўтаномнаму славацкаму ўраду. Замест Э. Бенеша, які адмовіўся ад пасады прэзідэнта і з'ехаў за мяжу, 30 лістапада 1938 г. прэзідэнтам другой Чэха-Славацкай Рэспублікі быў абраны Э. Гаха. Такім чынам, змены ў палітычным ладзе Чэхаславацкай Рэспублікі і парушэнні міжнародных пагадненняў прывялі да дэцэнтралізацыі краіны. Размова А. Гітлера з прэм'ер-міністрам аўтаномнай Славацкай Рэспублікі Ё. Ціса ў лютым 1939 г. дала ўраду гарантыі цэласнасці славацкіх зямель ад суседзей і атрымання незалежнасці. Глінкаўская славацкая народная партыя ўзяла накірунак на незалежнасць Славакіі. [2, с. 240-242].

Пасля Венскага арбітражу 2 лістапада 1938 г. большая частка венгерамоўных рэгіёнаў сталі неадлучнай часткай Венгрыі. Славакія страціла 10 390 км.кв. з насельніцтвам у 854 218 чалавек, з якіх 503 980 былі прадстаўнікі венгерскай нацыянальнасці [1, с. 210]. Праведзены ў Славакіі ў 1940 г. перапіс насельніцтва паказаў, што колькасць венграў, якія пражываюць на яе тэрыторыі, складала 46 689 чалавек ці 1,8% ад агульнай колькасці жыхароў [3, с. 139]. Прадстаўнікі венгерскай нацыянальнасці пражывалі ў асноўным у раёнах Нітры, Жытнага вострава і Златым Маравцы. Аднак, венгры пераважалі над славацкім насельніцтвам толькі ў 19 вёсках. Яны складалі большасць у нямецкамоўным рэгіёне – паўднёвым Спішы, дзе дзейнічала правенгерская Спішская партыя.

У лютым 1939 г. у Браціславе была арганізавана праца сумеснай чэхаславацка-венгерскай мінарытарнай камісіі. Яе асноўнай задачай была выпрацоўка нормаў па абароне венгерскай і славацкай нацыянальнай меншасцей у абедзвюх дзяржавах. Венгры настойвалі на абароне правоў венгерскага насельніцтва Браціславы. Яны гатовы былі абмеркаваць правы славакаў, але толькі на перададзеных ім тэрыторыях. Таксама славацкі ўрад хацеў разгледзіць пытання абароны правоў славакаў, пражываючых на ўсёй тэрыторыі Венгрыі. 18 лютага 1939 г. была падпісана двухбаковая дамова аб абмене насельніцтва і прадастаўленні грамадзянства [4, с. 25]. Як следства, праз некалькі дзён славацкія венгры былі выселены з Браціславы, так як яны атрымалі венгерскае грамадзянства

23 сакавіка 1939 г. венгерскія войскі ўварваліся на тэрыторыю Усходняй Славакіі і пачалася г.зв. "Малая вайна". У гэты ж дзень паміж Берлінам і Браціславай была падпісана "Ахоўная дамова". У адпаведнасці з ёй Германія брала на сябе абавязак ахоўваць палітычную незалежнасць і цэласнасць славацкай тэрыторыі [5, с. 305-306]. Праз пяць дзён пасля падпісання "Ахоўнай дамовы" Германія ўмяшалася ў славацка-венгерскі канфлікт і загадала двум бакам правесці мірныя перамовы.

Пад ціскам Берліна славацкі і венгерскі бакі дамовіліся спыніць баявыя дзеянні і стварыць нейтральную зону паміж дзвюма арміямі. 3 красавіка 1939 г. нямецкі пасол у Будапешце О. фон Эрдмансдорф нанёс візіт міністру замежных спраў Венгрыі І. Чакі, падчас якога закрануў пытанне аб будучай славацка-венгерскай мяжы. Пасол праінфармаваў міністра аб просьбе Славакіі падтрымаць іх. У размове О. фон Эрдмансдорф запытаў у І. Чакі аб гатоўнасці венгерскага ўрада пайсці на саступкі. Апошні заявіў, што "там, дзе прайшлі венгерскія салдаты, яны і застануцца" [6, с. 99].

Дзякуючы перамозе ў "Малой вайне" Венгрыя атрымала Сабранецкую акругу і частку акругі Свіна, што складала плошчу ў 1056 кв. км. і ўключала 74 вёскі з насельніцтвам у 40 777 чалавек, палова з якіх былі славакамі [6, с. 100]. Нягледзячы на гэта абодва ваюючыя бакі ацанілі ваенныя дзеянні паспяховымі для сябе. Славакі адчувалі, што яны здолелі спыніць венгерскую экспансію і забяспечыць цэласнасць тэрыторыі. Венгрыя, у сваю чаргу, дасягнула мэты ў "абароне" сваіх грамадзян. Германія ж імкнулася аслабіць малыя дзяржавы і павялічыць свой уплыў у Дунайскім рэгіёне.

Палітычныя і сацыяльныя інтарэсы славацкіх венграў прадстаўляла Аб'яднаная венгерская партыя на чале з Я. Эстэрхазі. Падчас незалежнай Славацкай Рэспублікі, ідэя Вялікай Венгрыі працягвала жыць у ідэалагічнай і палітычнай арыентацыі партыі. Яна арганізоўвала публічныя сходы для фінансавання розных сацыяльных мерапрыемстваў, імкнулася падначаліць культурныя таварыства пад сваёй апекай.

Партыя складала петыцыі з патрабаваннем далучыць славацкія памежныя гарады да Венгрыі. У накіраваным славацкаму ўраду мемарандуме 1939 г. утрымліваліся радыкальныя і правакацыйныя патрабаванні, якія закраналі не толькі культурныя аспекты, але і арганізацыю дзяржаўнага кіравання. Мэтай дадзеных ініцыятыў было імкненне даказаць прыгнёт венграў у Славакіі. Парламенцкая дзейнасць Я. Эстэрхазі была абмежавана запытамі аб фактах пераследу славацкіх венграў.

Ва ўнутрыпалітычных славацка-венгерскіх адносінах выкарыстоўваўся ўзаемны прынцып для абмежавання дзейнасці венгерскіх культурных і палітычных арганізацый, а ў Венгрыі наадварот. У змесце раздзелаў 91-94 Асноўнага закона Славацкай Рэспублікі ад 21 ліпеня 1939 г. гарантавалі правы этнічных груп на палітычную і культурную арганізацыю [7]. Наступны пункт замацаваў прынцып “правы нацыянальных груп, згаданых у Канстытуцыі дзейнічаюць настолькі, наколькі яны сапраўды выкарыстоўваюцца славацкай меншасцю на землях роднай дзяржавы адпаведна да этнічнай групы” [8, с. 13]. Ён даваў фармальную падставу для абароны славацкай меншасці на венгерскай тэрыторыі на працягу Другой сусветнай вайны.

На славацкіх землях падчас Другой сусветнай вайны дзейнічалі венгерскія таварыствы. Аб’яднаная венгерская партыя стварала венгерскія дамы, якія станавіліся культурнымі і палітычнымі цэнтрамі. У Нітры венгерскае таварыства збіралася ў прыватных кватэрах. Аналагічна ў Пезінку, Берналаку, Зволене і ў Рэвуцкім раёне члены таварыства збіраліся дома ў мясцовых жыхароў. У некаторых населеных пунктаў члены таварыстваў арандавалі памяшканні для сумесных гульняў, чытання перыёдыкі і сацыяльнай падтрымкі. Адкрыццё венгерскіх дамоў, пасля рэгістрацыі Аб’яднанай венгерскай партыі, атрымала афіцыйны дазвол. 1 снежня 1939 г. у Банскай Бістрыцы быў утвораны Саюз жанчын Цэнтральнаславацкай акругі партыі [9, с. 99-100].

У прапагандысцкіх мэтах венгры выкарыстоўвалі перыядычны друк. Венгерская прэса ў Славакіі на працягу 1939-1945 гг. мела дзве паўнавартасныя штодзённыя газеты з офісам у Брацілаве. Афіцыйным друкаваным органам Аб’яднанай венгерскай партыі была газета “ Új Hírek” з тыражом у 8 000 экзэмпляраў. Распаўсюджанай была газета “Esti Ujság”, якая выходзіла тыражом у 15 000 экзэмпляраў. Акрамя поўнафарматных газет у некалькіх гарадах выходзіла мясцовая перыёдыка на венгерскай мове. Славацкія сродкі масавай інфармацыі карысталіся тыповымі заявамі “венгр – прыгнятальнік” у процівагу “выхаванаму і гасціннаму славаку”. Пасля атрымання незалежнасці, славацкая прэса пісала аб самабытнасці славацкага народа ў параўнанні з прышлымі венграмі-качэўнікамі. Венгерскія медыя акцэнтавалі ўвагу на згуртаванасці і велічнасці свайго народа, кажучы аб большай блізкасці славакаў да венграў, чым да чэхаў. Такім чынам яны праводзілі думку аб магчымасці будучага ўваходжання славацкіх зямель у склад Венгрыі. Акрамя газет, венгерская прапаганда выкарыстоўвала раскіданыя лістоўкі, мапы, фатаграфічныя матэрыялы. Венгерскі даследчык М. Хетэны лічыць, што “ўзбуджаючай формай прапаганды былі таксама тэксты вершаў і песняў, якія ў сваіх рэпертуарах у розных выступленнях ці музыкальных носьбітах выкарыстоўвалі прадстаўнікі венгерскай нацыянальнасці.” [10, с. 109].

У 1940 г. быў праведзены перапіс насельніцтва ў Славакіі, у якім былі істотныя памылкі пры падліку славацкіх венграў. На думку венгерскіх палітыкаў пры яго правядзенні ўлады свядома занізілі колькасць венграў Славакіі. Лідар Аб’яднанай венгерскай партыі Я. Эстэрхазі ў маі 1941 г. накіраваў прэм’ер-міністру Славакіі В. Туку спісы з 1147 славацкіх грамадзян венгерскай нацыянальнасці, якіх мясцовыя ўлады аднеслі да славакаў ці немцаў. Да ліку антывенгерскіх мер з боку славацкіх дзяржаўных органаў трэба аднесці пастанову ад 13 сакавіка 1940 г. аб змяненні неславацкіх прозвішчаў дзяржаўных служачых славацкай нацыянальнасці. Так, у канцы 1940 г. раённы дэпартамент у Нітры склаў спіс 168 супрацоўнікаў, якім трэба было змяніць прозвішчы. На працягу сакавіка-красавіка 1941 г. у Трэнчынскай жупе было пададзена 62 адпаведныя заяўкі [9, с. 106-107].

Акрамя гэтага, славацкія сілавыя структуры займаліся выдаленнем з грамадскіх месцаў і будынкаў венгерскіх эмблем, статуй, карцін, сімвалаў, надпісаў. Гэта

практыка была звязана з дзейнасцю дэпартамента дзяржаўнай бяспекі, адной з задач якога была славакізацыя надпісаў. Так, Міністэрства ўнутраных спраў 28 мая 1940 г. у Шарыш-Земплінскай жупе загадала ліквідаваць венгерскія мемарыяльныя дошкі ў Прэшаве. Вынікам гэтага было зняцце 6 дошак у гонар дзяржаўных дзеячаў Аўстра-Венгрыі [9, с. 108].

У маі 1940 г. адносіны паміж Славакіяй і Венгрыяй абвастрыліся настолькі, што абедзве краіны сцягнулі да мяжы ваенных. Падставай паслужылі распаўсюджаныя ў Славакіі чуткі аб нападзе Венгрыі. Берлін імгненна ўмяшаўся ў славацка-венгерскі канфлікт і прызваў бакі да мірнага ўрэгулявання сітуацыі.

У жаданні палепшыць становішча славацкіх венграў Я. Эстэрхазі сустрэўся з міністрам замежных спраў Славакіі В. Тукам. Апошні падкрэсліў, што ў выніку далучэння да Траістага пакта славакі і венгры сталі саюзнікамі, а таму няма ніякіх перашкод для наладжвання добрасуседскіх адносін. У гэтай сувязі Эстэрхазі выказаў здзіўленне, спаслаўшыся на ранейшае выказванне міністра ўнутраных спраў А. Маха, які ў сваіх прамовах заяўляў аб незацікаўленасці Славакіі ў збліжэнні з венграмі [11, с. 72]. Прычынай такіх сяброўскіх адносін славацкага палітыка да Эстэрхазі з'яўлялася неабходнасць у падтрымцы мясцовых венграў перад паездкай у Рым. Задача візіта ў Італію заключалася ў спробе правесці рэвізію Венскага арбітражу 1938 г., з вяртаннем Славакіі Кошыцэ, Левіцы і Новых Замкаў. Але з гэтага нічога не атрымалася.

Восенню 1941 г. славацка-венгерскія адносіны зноў пагоршыліся. Прычынай паслужыў інцыдэнт 3 верасня 1941 г. на памежжы ў Новай Весі над Жытавай. Мясцовыя венгерскія ўлады абвясцілі аб жаданні змяніць існуючую мяжу. Славацкай рэакцыяй на гэта стала адпраўка войск на мяжу з Венгрыяй. Больш таго прэзідэнт Ё. Ціса праінфармаваў Берлін аб інцыдэнце. На наступны дзень венгерскі бок заверыў Германію, што ніякага канфлікту не было. На пачатку лістапада 1941 г. шэраг антывенгерскіх дэманстрацый і хваляванняў у некаторых славацкіх гарадах прывёў да таго, што Славакія і Венгрыя часова прыпынілі дыпламатычныя адносіны. 25-26 лістапада 1941 г. у Берліне адбылася сустрэча кіраўнікоў славацкага і венгерскага ўрадаў В. Тукі і Л. Бардашы, на якой быў уладжаны канфлікт і нармалізаваны адносіны [12, с. 235]. У межах сустрэчы міністры дамовіліся аб рэгістрацыі ў сваіх краінах раней забароненых палітычных і культурных партый славацкай і венгерскай этнічных груп.

З моманту абвяшчэння незалежнасці і далучэння да Траістага пакту Славакія стала саюзніцай Венгрыі, што прымушала ўлічваць гэты фактар пры вызначэнні нацыянальнай палітыкі ў дачыненні да венгерскай меншасці. Палітычныя лідары Славакіі ўсведамлялі, што Венгрыя не задаволіцца тэрыторыяй, якую яна атрымала па выніках першага Венскага арбітражу. Барацьба, зрэшты, адбывалася перш за ўсё на дыпламатычным і выведным палях. Але пазней славацкі ўрад сустрэўся не толькі з тэарэтычнымі канцэпцыямі перагляду межаў Венгрыяй, але і з практыкай. Адкрытая напружанасць у адносінах паміж Венгрыяй і славацкімі ўладамі ўспыхнула падчас "Малой вайны". Прэзідэнту Ё. Цісу не заставалася іншага выбару як вырашыць яшчэ адну праблему - венгерскае пытанне. Нацыянальным рухаючым элементам стала паняцце "нацыянальных ворагаў", супраць якіх аб'ядналіся ўсе палітычныя сілы ў Славакіі. У выніку страты паўднёвай частцы Славакіі, дзеянням венгерскага кіравання на арбітражнай тэрыторыі і пастаяннымі праблемамі на агульным памежжы, славацкаму ўраду прыйшлося дзейнічаць. На адным з сапернічаючых бакоў фігуравала Славакія, якая нясмела спрабавала абараніць славацкіх грамадзян. З іншага боку дзейнічала рэвізіяністкая Венгрыя, неабходнасцю якой было, наадварот, падтрымліваць нестабільнасць на гэтай тэрыторыі, а ў выніку – дамагчыся рэвізіі. Акрамя ўмяшання Берліна, можа быць, толькі прынцып узаемнасці быў у стане змякчыць катастрафічныя наступствы ўзаемнай варожасці.

**Бібліяграфічныя спасылкі:**


1. Viedenská arbitráž 2. novembrer 1938: Dokumenty II., Okupácia (2. novembrer – 14. marec) / zost. L. Deák. – Bratislava: Matica slovenska, 2003. 304 s.

2. Marsina, R. Slovenské dejiny. Martin: Matica slovenská, 1992. S. 230–263.
3. Šprocha, B. Demografický obraz Slovenska v rokoch 1938-1945. Bratislava: Muzeológia a kultúrne dedičstvo, 2016. – 199 s.
4. Сальков, А. П. Проблема границ и национальных меньшинств в чехословацко-венгерских отношениях (ноябрь 1918 г. – март 1939 г.) // Российские и славянские исследования : науч. сб. Вып. 7 / редкол. : А. П. Сальков, О. А. Яновский (отв. редакторы) [и др.]. Минск : БГУ, 2012. С. 9–28.
5. Slovensko-nemecké vzt'ahy 1938–1941 v dokumentoch: v 2 sv. Sv. I.: od Mníchova k vojne proti ZSSR [a kol.]. Bratislava: Universum, 2009. 1174 s.
6. Janek, I. The History of the Slovak-Hungarian "Little War" and Its Interpretations in National Histories / I. Janek // Prague Papers on the History of International Relations, 2. Praha: Univerzita Karlova, Ústřední knihovna, 2015. P. 85–101.
7. Ústavný zákon zo dňa 21. júla 1939 o Ústave Slovenskej republiky // Ústav pamäti národa [Электронны рэсурс]. URL: https://www.upn.gov.sk/data/pdf/ustava1939.pdf – Дата доступу: 12.10.2019.
8. Mitáč, J. Juh Slovenska po Viedenskej arbitráži 1938-1945 Bratislava: Ústav pamäti národa, 2011. 291 s.
9. Hetényi, M. The status of Hungarian minority in Slovakia in 1939 – 1940 // Slovensko medzi 14. marcom 1939 a salzburskými rokovaniami. Prešov: Universum, 2007. S. 93–111.
10. Hetényi, M. Propaganda v slovensko-maďarských vzťahoch v rokoch 1938 – 1945. // Forum Historiae. 2012. roč. 6, č. 2. S. 101–113.
11. Janek, I. János Esterházy a slovensko-maďarské diplomatické vzťahy v rokoch 1938-1941 // Slovensko v rokoch neslobody 1938-1989 II. Bratislava: Ústav pamäti národa, 2014. S. 58–74.
12. Пеганов, А. О. Секретные переговоры М. Каллаи и Й. Тисо в 1943 г. в контексте венгеро-словацких отношений в годы Второй мировой войны // Сборник научных статей молодых ученых: вып. 1 / В. Г. Шадурский (общ. ред.) [и др.]. Минск : Четыре четверти, 2012. С. 234–243.
13. Пеганов, А. О. Чехо-словацко-венгерские переговоры в ноябре 1938 – марте 1939 г. о реализации венского арбитражного решения // Российские и славянские исследования: науч. сб. Вып. 4 / редкол.: А. П. Сальков, О. А. Яновский (отв. редакторы) [и др.]. Минск: БГУ, 2009. С. 205–210.
14. Пушкаш, А. И. Внешняя политика Венгрии: Февраль 1937 – сентябрь 1939 г. М.: Институт славяноведения РАН, 2003. С. 401–440.
15. Носкова, Х. Венгерское меньшинство в Чехословакии и словацкое – в Венгрии: решение участи // Национальная политика в странах формирующегося советского блока. 1944-1948. М.: Наука, 2004. С. 285–309.
16. Сальков, А. П. Проблема границ и национальных меньшинств в чехословацко-венгерских отношениях (ноябрь 1918 г. – март 1939 г.) // Российские и славянские исследования : науч. сб. Вып. 7 / редкол. : А. П. Сальков, О. А. Яновский (отв. редакторы) [и др.]. Минск : БГУ, 2012. С. 9–28.
17. Hunćik, P. Madarska mensina ve Slovenskej republice // Etnicke mensiny Stredni Evrope: konflict nebo integrace. Praha: G plus G, 1999. S. 204–218.
18. Hetényi, M. Slovensko-maďarské pomedzie v rokoch 1938 - 1945 Nitra: Univerzita Konštantína Filozofa, 2008. 216 s.
19. Grečo, M. Slováci a revízia hraníc: maďarské klamstvá. Bratislava: Eko-konzult, 2008. – 68 s.
20. Pekár, M. Dejiny Slovenska 1918–1945. Košice: Univerzita Pavla Jozefa Šafárika, 2015. 197 s.

УДК 338.22(438)"200"

## АСАБЛІВАСЦІ ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ ПОЛЬШЧЫ Ў 2000-Я ГАДЫ

**Л. А. Козік**

*Белорусский государственный университет,*
*пр.Независимости, 4, 220030, г.Минск, Беларусь, kozik@bsu.by*

Эканамічнае развіццё Польшчы ў 2000-я гады цесным чынам звязана з Еўрапейскім саюзам. Рэформы польскіх уладаў былі закліканы усталяваць у краіне рынкавую эканоміку і заканадаўча дастасаваць яе да агульнаеўрапейскіх патрабаванняў. Пасля ўступлення ў ЕС у Польшчу пайшлі новыя інвестыцыі і тэхналогіі, пашырыліся замежныя рынкі збыту,